# Глава V. ГАСПАДАРЧА-ФІНАНСАВЫЯ ОРГАНЫ

## 5.1. Казённыя палаты

*(А. П. Жытко, С. А. Талмачова)*

У адпаведнасці з рэформай 1775 г. самай важкай адміністрацыйна-гаспадарчай і фінансавай установай, якая ведала ў губерні падатковай справай, прыбыткамі і выдаткамі казённых сродкаў, дзяржаўнай маёмасцю і сялянамі, улікам насельніцтва і яшчэ мноствам фінансавых і гаспадарчых спраў, з'яўлялася **казённая палата**. Яна сачыла за поўным і своечасовым зборам падаткаў, спагнаннем нядоімак, захаванасцю сабраных сум, кантралявала грашовую справаздачнасць устаноў і службовых асоб. У яе кіраванні знаходзіліся казённыя землі, лясы, вадаёмы, дзяржаўныя сяляне, вінныя водкупы і падрады, саляная справа і іншыя крыніцы прыбытку. Палата ведала казённымі і публічнымі будынкамі, будаўнічымі і дарожнымі работамі, ажыццяўляла нагляд за прыватным гандлем і прамысловасцю. Ёй даручалася сачыць, каб у губерні не праводзілася спагнанне незаконных збораў. Яна вяла статыстычную работу па рэвізскім уліку падатковага насельніцтва, гэта значыць арганізоўвала працу рэвізскіх камісій і г. д.[1]

Членамі казённай палаты з'яўляліся: віцэ-губернатар (старшыня), дырэктар эканоміі, губернскі казначэй, дарадчык, 2 асэсары і губернскі сакратар. Дырэктар эканоміі і губернскі казначэй прызначаліся Сенатам на прадстаўленні губернскага праўлення[2].

Паступова функцыі і штаты казённых палат пашыраліся. Так, у адпаведнасці з указам Сената ад 19 красавіка 1798 г. «Об утверждении штатов лесного управления Российской империи»[3], у складзе беларускай казённай палаты была заснавана пасада чыноўніка па ўпраўленні казённымі лясамі – губернскага фаршмайстара. У яго абавязкі ўваходзіла апісанне і складванне генеральных і прыватных карт і планаў казённых лясных дач, нагляд за высечкай лесу, спыненне знішчэння лясоў, незаконнага продажу і сплаву кара-

[1] ПСЗРИ. Собр. 1-е. – Т. 20 (1775–1780). – № 14 392.– С. 229–304.

[2] НГАБ. – Ф. 2567. Воп. 1. Спр. 195. Арк. 182–195; Ф. 3219. Воп. 1. Спр. 1. Т. 2. Арк. 444–476; ПСЗРИ. Собр.1-е. – Т. 20 (1775–1780). – № 14 392.– С. 229–304.

[3] НГАБ. – Ф. 3219. Воп. 1. Спр. 650. Арк. 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ